# Год якасці

## Чаму ён нам патрэбен менавіта цяпер

Падчас нядаўняй рабочай паездкі ў Бялыніцкі раён Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што будучы год трэба аб'явіць Годам якасці. Усё добра ў нас, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, маючы на ўвазе аб'ёмы вытворчасці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. І попыт на беларускую прадукцыю каласальны, такі, што не паспяваем нават патрэбы Расіі забяспечыць. Але, паводле слоў Прэзідэнта, яшчэ ёсць праблемы з якасцю.

Зразумела, што пасля знаёмства з сацыяльна-эканамічным развіццём раёна кіраўнік дзяржавы меў на ўвазе перш за ўсё, што называецца, практычны бок пытання – наша гаспадаранне на зямлі, працу ў прамысловай сферы і ў абслугоўванні, стан дарог. Што цалкам абгрунтавана: аснова ўсяго, падмурак развіцця – эканоміка. Але на чым акцэнтуе ўвагу Прэзідэнт, калі разабрацца? Сітуацыя ў айчыннай эканоміцы сёння ўжо не тая, што была яшчэ адносна нядаўна. Беларусь так ці інакш справілася з санкцыямі, адаптавалася да новых умоў і актыўна, упэўнена выбудоўвае вектар свайго далейшага руху наперад і пры гэтым відавочная добрая дынаміка. І сапраўды, па многіх напрамках растуць тыя самыя аб'ёмы, пра якія казаў Прэзідэнт. Гэта добра з усіх бакоў, не толькі з эканамічнага. У Год міру і стварэння наша краіна яскрава дэманструе свету сваю прыхільнасць выбранаму прыярытэту, а гэта самаадданая, стваральная праца пад мірным небам.

Тэмп набралі, і самы час больш пільна пагледзець на якасць таго, што робім для сябе і на экспарт. Бо пры шалёным попыце на беларускае лёгка паддацца спакусе «трошачкі» нешта спрасціць, штосьці недзе замяніць на быццам аналагічнае, затое выпусціць больш і адпаведна зарабіць. Першапачаткова такая тактыка, напэўна, спрацуе, але радавацца доўга не давядзецца. А самае галоўнае –

**Мінскі завод грамадзянскай авіяцыі № 407 – гэта магутны вытворчы комплекс, які не толькі абслугоўвае практычна ўсе тыпы паветраных судоў расійскай і заходняй вытворчасці, але і выпускае камплектуючыя дэталі для самалётаў**



рэпутацыі беларускай якасці, якая напрацоўвалася дзесяцігоддзямі і на што наш Прэзідэнт паклаў нямала ўласных сіл, будзе нанесены непапраўны ўрон. Рытарычнае пытанне: яно нам трэба? Не, нам патрэбен Год якасці! Больш за тое, варта згадаць, пра якую менавіта якасць неаднойчы выказваўся кіраўнік дзяржавы.

Возьмем, напрыклад, імпартазамяшчэнне. Актуальная ў прынцыпе заўсёды, тэма набыла асаблівую вастрыню колькі гадоў таму праз жорсткія санкцыі супраць нашай краіны. Так, знік шэраг тавараў на спажывецкім рынку, з цяжкасцямі па набыцці камплектуючых сутыкнуліся вытворцы. Шмат чаго спатрэбілася «замясціць», але ж задача не проста стварыць штосьці аналагічнае імпартнаму ўзору, а лепшае за яго, больш якаснае. І ў нашых вытворцаў гэта атрымалася. Не ва ўсіх, вядома, але прыкладаў такіх хапае. Вось адзін з іх, магчыма, не самы значны і паказальны, тым не менш датычыць ці не кожнага.

Маю на ўвазе такую групу тавараў, як касметыка. Беларусаў прывучылі-прывязалі да імпарту, раней на айчынную прадукцыю асабліва не звярталі ўвагі, ўспрымалі яе часцяком паблажліва. І тут на табе – імпартны паток змяльчэў, а цэны шалёна выраслі. Да гонару вытворцаў, яны своечасова ўлічылі рыначныя нюансы і адрэагавалі шырокім асартыментам імпартазамяшчальных навінак. Ды такіх, што іх цяпер змятаюць з нашых паліц не толькі расіяне, а і еўрапейскія грамадзяне – з той жа Польшчы, Літвы, Латвіі. А чаму? Таму што якасная прадукцыя, складнікі яе натуральныя, сучасная прыгожая ўпакоўка, цана прыдатная.

Пару разоў назіраў такі «хапун». Ведаеце, шчыра скажу, адчуў гонар за нас, беларусаў, за краіну. Мяркуеце, дробязь і эмоцыі мае не варты выедзенага яйка? Як сказаць. Часам мы самі не цэнім таго, што падабаецца і чым захапляюцца іншыя, нават зайздросцяць. З такіх «дробязей», мне падаецца, складаецца наша стаўленне да Радзімы, праз іх прабіваюцца парасткі патрыятызму. Ёсць вялікая надзея, што мяркуемы Год якасці дасць нам яшчэ больш падстаў ганарыцца роднай краінай.

Ён, 2024-ы, надыдзе вельмі хутка – усяго праз два месяцы з невялічкім хвосцікам. Але я не пра час, што, як пясок паміж пальцаў, струменіць імклівасцю дзён.

Згадаем, што свайго прыходу чакае вельмі важны для будучыні Беларусі год. Упершыню ў палітычнай гісторыі нашай краіны пройдзе адзіны дзень галасавання: 25 лютага мы абяром дэпутатаў парламента і мясцовых Саветаў. Вяскоўцы атрымаюць ажно чатыры бюлетэні: яны мусяць прагаласаваць за кандыдатаў у Палату прадстаўнікоў, абласны і раённы Саветы, у сельскі ці пасялковы Савет. Ці варта лішні раз казаць пра тое, як важна для ўсіх нас, каб у заканадаўчыя органы трапілі разумныя людзі, патрыёты, а не пустазвоны і аматары хайпу. У цвярозым, узважаным выбары – праява якасці нашай грамадзянскай пазіцыі і яе сталасці, адказнага стаўлення да лёсу сваёй краіны.

На працягу 60 дзён пасля адзінага дня галасавання, паводле заканадаўства, адбудзецца Усебеларускі народны сход, на які ўскладзена вялікая і адказная місія. Ён «вызначае стратэгічныя кірункі развіцця грамадства і дзяржавы, забяспечвае непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду» – чытаем у Законе Рэспублікі Беларусь «Аб Усебеларускім народным сходзе». Абсалютная большасць тых, каго абяром у адзіны дзень галасавання, стануць яго дэлегатамі. З гэтага вынікае, што якасць нашага выбару павінна быць, магчыма, як ніколі высокая. Сапраўды, наперадзе час, які аб'ектыўна вызначыць нашу грамадзянскую вартасць.

…«Рыхтуйцеся, што наступны год у нас – Год якасці», – звярнуўся Прэзідэнт да бялыніцкіх кіраўнікоў і тых, хто суправаджаў лідара дзяржавы падчас рабочай паездкі. Як па мне, гэтыя словы Аляксандра Лукашэнкі датычаць усіх нас. На кожным працоўным месцы, у зносінах паміж сабою, у сваім палітычным выбары ўрэшце, увогуле абсалютна ва ўсім, што на карысць нашай Беларусі, варта паклапаціцца пра якасць. Толькі ўсур'ёз, па сутнасці. Тады і самі здзівімся, як можа змяніцца да лепшага наша жыццё.

***Ігар ГАНЧАРУК***